# РАЗВІЦЦЁ ІДЭЙ ФАРМАЛІЗМУ ВА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІМ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВЕ

**А. У. Сцельмашук**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*alya.kincheva@mail.ru;*
*Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук, дацэнт П. І. Навойчык*

Разглядаюцца пытанні развіцця фармалізму ва ўсходнеславянскім літаратуразнаўстве. Найбольшае развіццё фармалізм атрымаў у Расіі, дзе сфарміраваўся ў самастойную фармальную школу, якая адкрыла новыя шляхі і прыёмы даследавання мастацкага тэксту і аказала значны ўплыў на развіццё іншых літаратуразнаўчых метадаў. Ідэі прадстаўнікоў фармальнай школы па-ранейшаму захоўваюць сваю актуальнасць пры даследаванні літаратурнага працэсу першай паловы XX стагоддзя. Ідэі новага мастацкага метаду знайшлі сваіх прыхільнікаў таксама ў беларускай і ўкраінскай літаратурах. У Беларусі фармалізм не набыў асаблівай папулярнасці, аднак прыцягваў увагу вядучых літаратурных крытыкаў і літаратуразнаўцаў і лёг у аснову некаторых іх прац.

***Ключавыя словы:*** фармалізм; фармальны метад; фармальная школа; усходнеславянскія літаратуры; форма і змест.

# РАЗВИТИЕ ИДЕЙ ФОРМАЛИЗМА В ВОСТОЧНОСЛАВЯНСКОМ ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИИ

**А. В. Стельмашук**

*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*alya.kincheva@mail.ru;*
*Научный руководитель – кандидат филологических наук, доцент П. И. Навойчик*

Рассматриваются вопросы развития формализма в восточнославянском литературоведении. Наибольшее развитие формализм получил в России, где сформировался в самостоятельную формальную школу, открывшую новые пути и приемы исследования художественного текста и оказавшую значительное влияние на развитие других литературоведческих методов. Идеи представителей формальной школы по-прежнему сохраняют свою актуальность при исследовании литературного процесса первой половины XX века. Идеи нового художественного метода нашли своих сторонников также в белорусской и украинской литературах. В Беларуси формализм не приобрел особой популярности, однако привлекал внимание ведущих литературных критиков и литературоведов и лег в основу некоторых их работ.

***Ключевые слова:*** формализм; формальный метод; формальная школа; восточнославянские литературы; форма и содержание.

# DEVELOPMENT OF FORMALIST IDEAS IN EAST SLAVIC LITERATURES

**A. V. Stselmashuk**

*Belarusian State University,*
*4 Independence Avenue, 220030, Minsk, Belarus,*
*alya.kincheva@mail.ru;*
*Supervisor – PhD, Ass. Professor P. I. Navoychik*

The article deals with the development of formalism in East Slavic literary studies. The greatest development of formalism was in Russia, where it formed into an independent formal school, which opened new ways and methods of research of the artistic text and had a significant influence on other literary methods. The ideas of the representatives of the formal school are still relevant in the study of the literary process of the first half of the twentieth century. The ideas of the new artistic method found their representatives in Belarusian and Ukrainian literature. In Belarus, formalism did not receive special popularity, but it attracted the attention of leading literary critics and literary critics and formed the basis of some of their works.

***Keywords:*** formalism; formal method; formal school; East Slavic literatures; form and content.

На мяжы XIX–XX ст. адбываецца станаўленне новых мастацкіх сістэм, што прыводзіць да пошуку новых эстэтычных ідэалаў і ўзнікнення шматлікіх літаратурных школ, напрамкаў і плыняў. На змену рэалізму прыходзіць мадэрнізм, які кардынальным чынам змяніў успрыманне мастацтва. Пошук новых форм у літаратуры прывёў да перамены суадносін паміж формай і зместам літаратурнага твора, што ў выніку абумовіла зараджэнне такой з’явы, як фармалізм. Напачатку ён праявіўся ў выяўленчым мастацтве, а пасля знайшоў сваё адлюстраванне ў літаратуразнаўстве. Новы літаратурны метад пачаў фарміравацца ў Расіі пасля 1910 года і быў звязаны з узнікненнем двух аб’яднанняў: Маскоўскага лінгвістычнага гуртка, які ўзначальваў Р. Якабсон (1915 г.), і ОПОЯЗа (Таварыства даследавання паэтычнай мовы, 1916 г.), у склад якога ўваходзілі В. Шклоўскі, В. Брык, Б. Эйхенбаум, Ю. Тынянаў і інш. У іх працах былі сфармуляваны новыя падыходы да аналізу літаратурнага твора.

Фармалізм як літаратуразнаўчы метад – гэта даследаванне мастацкага тэкста і яго формы, зыходзячы з таго, што прадметам вывучэння літаратуры павінен стаць не сам тэкст, а яго літаратурнасць – тое, што робіць твор па-сапраўднаму мастацкім. Для фармалістаў былі важнымі два бакі тэкста: стылістычны (сукупнасць прыёмаў «паэтычнай» мовы) і кампазіцыйны («фабула» – «сюжэт»), якія павінны выклікаць эфект «здзіўлення – адзін з галоўных тэрмінаў фармалістаў, уведзены В. Шклоўскім. «“Здзіўленне” – апісанне ў мастацкім творы чалавека, прадмета або з’явы, як бы ўпершыню ўспрынятых, якія набываюць новыя прыкметы. Адсюль нават звыклы і прызнаны прадмет, як усякая новая з’ява, можа здацца незвычайным, дзіўным» [1, с. 188].

Развіццё фармалізму адбывалася дынамічна, і ён даволі хутка распаўсюдзіўся ва ўсіх усходнеславянскіх літаратурах. Атрымаўшы прызнанне ў рускай літаратуры ў

сярэдзіне другога дзесяцігоддзя, ужо праз пару гадоў яго ўплыў праявіўся ва ўкраінскай літаратуры, а на пачатку 20-х гадоў XX ст. ідэі фармалістаў знайшлі адлюстараванне ў працах беларускіх літаратуразнаўцаў.

Руская фармальная школа была арыгінальнай з'явай і не мела аналогіі ў заходнееўрапейскім літаратуразнаўстве, хаця тут мелі месца і агульныя тэндэнцыі, і пэўныя супадзенні: пазітывізм як метадычная аснова вывучэння мастацтва, разуменне мастацтва як «іманентнага рада», якое развіваецца па сваіх унутраных законах [2, с. 71]. Першым творам, дзе можна назіраць прыкметы фармалісцкай накіраванасці, лічыцца брашура В. Шклоўскага «Уваскрашэнне слова» (1914 г.). Аўтар разважае аб форме, як аб адным з важных элементаў твора: «Калі мы захочам стварыць азначэнне «паэтычнага» і наогул «мастацкага» ўспрымання, то, безумоўна, звернем увагу на азначэнне: «мастацкае» успрыманне – гэта такое ўспрыманне, пры якім перажываецца форма (можа быць, і не толькі форма, але форма абавязкова)» [3, с. 46]. З'яўленне фармальнай школы, або ОПОЯЗа, адбылося ў 1916 годзе (В. Б. Шклоўскі, Б. М. Эйхэнбаум, Ю. М. Тынянаў, О. Брык і інш), а першым праграмным маніфестам фармалістаў лічыцца «Мастацтва як прыём» (1917 г.) В. Шклоўскага, дзе ён адмаўляецца ад вобраза як ад асновы ўспрымання мастацтва, разважае аб «паэтычнай» і «практычнай» мове і ўводзіць адно з ключавых паняццяў фармалізму – «здзіўленне». Для прадстаўнікоў фармальнай школы аб'ектам даследавання быў твор мастацтва, яго структура, а не тое, што адлюстравана ў ім. Даследчыкі літаратуры павінны засяродзіцца на вывучэнні формы, структуры і моўных сродкаў.

Цікавасць да вывучэння фармальнага аспекту развіваецца ва ўкраінскай літаратуры сінхронна са з'яўленнем тэарэтычных прац ОПОЯЗа. А. Шамрай так адзначаў пачатак развіцця фармальнага метаду ва ўкраінскім літаратуразнаўстве: «З часоў выхаду ў свет кнігі "Таварыства вывучэння паэтычнай мовы", асабліва пасля з'яўлення ў 1919 годзе зборніка "Паэтыка" <…> усюды, нават ва ўтульных і далёкіх ад цэнтра правінцыяльных закутках, пачалі ўзнікаць гурткі "фармалістаў", пачалі абмяркоўвацца модныя пытанні пра стыль, рытміку, метрыку» [5, с. 233].

Літаратуразнавец А. Бялецкі з'ўляецца ключавой персонай першых украінскіх фармалістаў. Ён аб'яднаў вакол сябе маладых аспірантаў і студэнтаў Харкаўскага ўніверсітэта, дзе быў арганізаваны «гісторыка-літаратурны гурток». І. Айзеншток, адзін з вучняў Бялецкага, так згадваў пра гурток: «<…> большая колькасць пасяджэнняў прысвячалася ўзаемнай інфармацыі аб кнігах і артыкулах, якія змяшчаюць "новы падыход" ("новы" ў параўнанні з традыцыйным, "акадэмічным" літаратуразнаўствам") да вывучэння з'яў мастацкай літаратуры» [6, с. 145–146]. Навуковы інтарэс А. Бялецкага ў 1920-я гады быў сканцэнтраваны на пытаннях тэорыі і метадалогіі літаратуры, галоўным чынам на вывучэнні чытача як «фактара індывідуальнай пісьменніцкай творчасці і агульнага літаратурнага працэсу» [6, с. 152]. У адрозненне ад расійскіх фармалістаў, А. Бялецкі не выступаў з крытыкай А. Патэбні, а наадварот, спрабаваў аб'яднаць псіхалагічную школу з ідэямі фармалізму. Фігура А. Бялецкага з'ўляецца адной з вядучых для разумення працэсу рэцэпцыі ідэй рускага фармалізму

ва ўкраінскай літаратуры. Ён меў прафесійныя і сяброўскія стасункі з членамі ОПОЯЗа, уступаў з імі ў палеміку, стварыў уласную школу, дзе сумяшчаў розныя падыходы да вывучэння літаратуры.

Украінскія крытыкі і тэарэтыкі літаратуры, як і рускія фармалісты, вывучалі паэтычную мову і фармальныя элементы паэзіі скрозь прызму кампазіцыі і сюжэтабудавання. Яны імкнуліся выйсці за рамкі акадэмізму. У першай палове 1920-х гадоў з'яўляецца шэраг манаграфій, прысвечаных вывучэнню паэзіі: падручнік С. Гаеўскага «Тэорыя паэзіі» (1921 г.), вучэбны дапаможнік М. Йогансена «Элементарныя законы версіфікацыі (вершаскладання)» (1921 г.), практычны дапаможнік В. Палішчука «Як пісаць вершы» (1921 г.) і інш.

Фармальны напрамак знайшоў сваё адлюстраванне і ў беларускай літаратуры. У 1920-х гадах у Беларусі адбываецца ўздым авангардызму, які склаўся ў шэрагах літаратурнага аб'яднання «Маладняк», часткова праявіўся ў творчасці прадстаўнікоў «Узвышша» і Беларускай літаратурна-мастацкай камуны, якая была арганізавана на падабенства расійскага ЛЕФа (левы фронт мастацтва). Праўда, уплыў ідэй фармальна-мастацкага падыходу да творчасці выявіўся пераважна ў паэтыцы «Маладняка» [7, с. 238], а не ў тэарэтычных працах. Увогуле трэба прызнаць, што фармалізм не знайшоў у беларускім літаратуразнаўстве шматлікіх прыхільнікаў.

Адным з тых, хто праявіў найбольшую цікавасць да фармальнага напрамку ў літаратуразнаўстве, быў А. Вазнясенскі. Новы падыход да ацэнкі літаратурнай творчасці праявіўся ў такіх працах вучонага, як «Паэтыка М. Багдановіча» (1926), «Асноўныя прынцыпы пабудовы беларускай навукі аб літаратуры» (1927), «Традыцыя "фармальных" (эстэтычных) даследаванняў у навуцы пра літаратуру» (1927) і інш. Беларускі літаратуразнаўца ніколі не належаў ні да апаязу, ні да блізкіх яму гурткоў, фармалізм А. Вазнясенскага – самастойны, яўлахаўскай школы, і не такі радыкальны, як у В. Шклоўскага ці ў Б. Эйхенбаума [8, с. 6]. У сваім артыкуле «Асноўныя прынцыпы пабудовы беларускай навукі аб літаратуры» А. Вазнясенскі намагаецца акрэсліць, па якіх прынцыпах адбываецца станаўленне беларускага літаратуразнаўства ў 20-я гады XX ст. і спрабуе спалучыць фармальны і сацыялагічны метады: «Традыцыйнае адрозьніваньне "зьместу" і "формы" ня губляе свайго значэньня і пасьля тых закідаў, якія былі зроблены «формалістымі» іх прыхільнікамі. Іх паказаньне на тое, што "ўмоўнае супроцьстаўленьне формы і зьместу ("як" і "што") у навуковым досьледзе прыводзіла заўсёды да зацьвярджэньня іх злучнасьці ў эстэтычным аб'екце і, дзякуючы гэтаму, да "малое плённасьці пры высьвятленьні спэцэфічных асаблівасьцей чыста фармальнага моманту ў мастацкай структуры твору мастацтва", ня маючы пад сабою вытвараючага грунту» (захаваны аўтарскі правапіс) [9, с. 142]. У іншым тэзісе аўтар сцвярджае, што фармалізм са сваім падыходам да твораў можа даць грунтоўны падмурак для аўтаномнага (але не зусім, таму што аўтар спрабуе ўнесці прыёмы фармальнага метаду ў культурна-гістарычны метад) даследавання літаратуры і яе літаратурнасці: «З нашага пункту погляду, літаратурны твор ёсьць зьявішча эстэтычнага парадку, прадстаўляючае з сябе складаны організм, які вытвараецца з цэлага шэрагу складаных элемэнтаў таксама эстэтычнай якасьці. Яна выпаўняе пэўныя заданьні поэтычнага характару, зьяўляючыся з гэтага боку сродкам

для дасягненьня пэўных мастацкіх мэтаў, прыёмам поэтычнай творчасьці. Толькі гэтыя мастацкія актыўнасьці, як у разрозьненым відзе, так і ў іх адзінстве, могуць быць прадметам гістарычна-літаратурных вывучэньняў. Толькі той або іншы асобны элемэнт мастацкага твору зьяўляецца літаратурным фактам, вывучэньне якога толькі можа быць грунтам для пабудовы навукі аб літаратуры» (аўтарскі правапіс) [9, с. 142–143]. Але артыкул пісаўся ў 1927 г. і А. Вазнясенскі мусіў разважаць не аб «чыстым» фармальным напрамку, а ўжо аб яго сінтэзе з гісторыка-культурным метадам і сцвярджаць, што не толькі праз «прыёмы» можна даследаваць літаратуру (асэнсоўваў фармальны аналіз і эстэтычную крытыку): «Адыходзячы ад гэтых меркаваньняў, мы лічым, што поэтыка заключае ў сабе ня толькі вучэньне, а спосабах альбо прыёмах пабудовы мастацкіх твораў; яна ставіць сваёй задачай апісаньне, констатаваньне ўсяго налічча мастацкіх актыўнасьцей, якія ствараюць літаратурны твор, з боку іх прыроды – формальнай і тэматычнай, а таксама выпаўняемых імі мастацкіх функцый – іх тэлеолёгії» (аўтарскі правапіс) [9, с. 146].

Варта адзначыць яшчэ аднаго літаратуразнаўцу, які цікавіўся фармальным метадам і даследаваў творчасць М. Багдановіча з погляду фармальнага напрамку, – гэта Ул. Дзяржынскі (Ул. Чаржынскі). Яго артыкул «Багдановіч як стылізатар беларускага вершу» (1922 г.) – першае даследаванне, дзе паэтыка М. Багдановіча разглядаецца па фармальных прынцыпах. Аўтар даследаваў метрыку і рыфму зборніка «Вянок» і падлічыў, колькі варыянтаў метрыкі выкарыстоўваў М. Багдановіч, якія рыфмы найчасцей сустракаюцца ў яго паэзіі. «Пераважная частка прыгожага пісьменства наогул ёсць замкнёна ў рамкі верша» [8, с. 41], – так пачынаецца артыкул аб М. Багдановічу, і ўжо ў гэтых словах адчуваецца ўплыў фармалістаў. Ул. Дзяржынскі піша аб тым, што ў беларускім літаратуразнаўстве форме амаль не надаецца ўвагі і творы разглядаюцца толькі праз змястоўнасць сюжэта: «Свядомае беларускае грамадзянства дагэтуль захоплена яшчэ навізною нашага пісьменства, дагэтуль яшчэ не мае адвагі крытычна падысці да яго, не мае адвагі правесці раўналежную з іншымі літаратурамі, яно быццам баіцца, каб ад шорсткага дотыку крытыкі не страціла нашае пісьменства таго златабляску, якім свядома акружае яго кожны беларусін-адраджэнец. Беларускае грамадзянства дагэтуль яшчэ цікавіцца выключна адным зместам нашага пісьменства, не звяртаючы ўвагі на тыя формы, у якіх падносяць гэты змест яму беларускія пісьменнікі» [8, с. 42]. Такім чынам, аўтар уздымае пытанне аб тым, што беларускае літаратуразнаўства не вельмі зацікаўлена ў новым літаратуразнаўчым метадзе.

Некаторыя аспекты фармальнага напрамку ў паэзіі распрацоўваў таксама А. Бабарэка. Падобныя ідэі мы сустракаем у яго літаратурна-крытычных працах «Фармальна-вобразныя асаблівасці вершаў Я. Пушчы», «Слова і мастацтва: Заўвагі аб фармальнай школе і паэзіі Я. Пушчы» і інш. Аднак унутрыпалітычныя ўмовы ў Савецкай Беларусі ўжо не давалі ранейшай свабоды да навуковых росшукаў, а таму можа падацца, што беларускае літаратуразнаўства не праявіла вялікай цікавасці да новага метаду. І хаця асобныя паэты выкарыстоўвалі наватарскія прыёмы ў сваёй творчасці, аднак літаратурна-крытычных артыкулаў, тэарэтычных прац, падручнікаў, якія б развівалі ідэі фармалізму, на жаль, няма.

Такім чынам, мы акрэслілі часавыя рамкі пашырэння фармалізму ва ўсходнеславянскіх літаратурах, а таксама вызначылі, дзе ён атрымаў найбольшае развіццё. Ідэі фармалістаў паспрыялі фарміраванню новага падыходу да вывучэння літаратуры як сістэмы, якую можна аналізаваць праз мову і форму, што ў далейшым паўплывала на з'яўленне такога напрамку, як структуралізм, які развіў і дапоўніў ідэі фармалізму.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Квятковский А. П.* Поэтический словарь. Москва: Советская энциклопедия, 1966.
2. «История формализма в литературоведении» в контексте научной мысли Р. Г. Назирова (предисловие к публикации) [Электронный ресурс]. URL: http://nevmenandr.net/nazirov/1sbrnk_formalizm.pdf (дата обращения: 26.09.2024).
3. *В. Б. Шкловский* Воскрешение слова [Электронный ресурс]. URL: https://russianway.rhga.ru/upload/main/R.C.The%20Iron%20Age/45%2051.pdf. (дата обращения: 26.09.2024).
4. *Кэрил Эмерсон.* Очерки по русской литературной и музыкальной культуре [Электронный ресурс]. URL: https://e-univers.ru/upload/iblock/aed/qyl871d2mezohhbnbdex2qax7eksgl6b.pdf. (дата обращения: 26.09.2024).
5. Червоний шлях: громадсько-політичний і літературно-науковий місячник/ ред. Г. Ф. Гринько. Харків, 1926 [Электронный ресурс]. URL: Червоний шлях : громадсько-політичний і літературно-науковий місячник (1926) (irbis-nbuv.gov.ua) (дата обращения: 30.09.2024).
6. *Бабак Г., Дмитриев А.* Атлантида советского нацмодернизма: формальный метод в Украине (1920-я – начало 1930-х). Москва: Новое литературное обозрение, 2021.
7. *Багдановіч. І.Э.* Авангард і традыцыя: бел. паэзія на хвалі нац. Адраджэння. Мінск: Бел. навука, 2001.
8. Максім Багдановіч: вядомы і невядомы: зб. літаратуразн. і арх. матэрыялаў / уклад. і камент. Ц. В. Чарнякевіча; прадм. і гласарый Ю. В. Пацюпы. Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011. С 3 – 13, 41 – 57. ISBN 978-985-6994-74-9.
9. Працы Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў Менску. Выданьне Праўленьня Б.Д.У. Менск, 1927. С. 137–157.